# Створаны інструмент для ацэнкі якасці работы дзяржаўных арганізацый, якія аказваюць паслугі насельніцтву - Партал рэйтынгавай ацэнкі дзяржаўных арганізацый (качество-услуг.бел)

У мэтах забеспячэння ў Рэспубліцы Беларусь празрыстага і аб'ектыўнага механізму ацэнкі эфектыўнасці дзейнасці дзяржаўных арганізацый па аказанні паслуг, якія забяспечваюць жыццядзейнасць насельніцтва, і адміністрацыйных працэдур Міністэрства сувязі і інфарматызацыі прапануе грамадзянам скарыстацца магчымасцямі **Партала рэйтынгавай ацэнкі дзяржаўных арганізацый**.

Партал арыентаваны на грамадзян, даючы ім зручны інструмент для размяшчэння свайго меркавання пра якасць працы дзяржаўных арганізацый, кожная з якіх можа быць імі ацэненая па 5-бальнай шкале па наступных крытэрыях:

прастата і зразумеласць працэсу атрымання паслугі;

даступнасць інфармацыі аб парадку атрымання паслугі;

захаванне ўстаноўленага тэрміну прадастаўлення паслугі;

ветлівасць і добразычлівасць супрацоўнікаў.

Падрабязнае апісанне парадку работы з парталам прыведзена ў раздзеле «**Аб партале**».

На падставе выстаўленых грамадзянамі адзнак прадугледжана аўтаматычнае фарміраванне на Партале адпаведнага рэйтынгу дзяржаўных арганізацый. Такі рэйтынг дазволіць павысіць эфектыўнасць і якасць работы дзяржаўных устаноў, стварыць камфортнае асяроддзе для жыцця грамадзян.

** Партал рэйтынгавай ацэнкі арганізацый распрацаваны НІРУП «Інстытут прыкладных праграмных сістэм» па заказе Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь у мэтах рэалізацыі Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2006 г. № 2 "Аб дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату і павышэнні якасці забеспячэння жыццядзейнасці насельніцтва" у частцы стварэння і ўкаранення сістэмы рэйтынгавай ацэнкі грамадзянамі эфектыўнасці дзейнасці арганізацый, якія аказваюць паслугі, якія забяспечваюць жыццядзейнасць насельніцтва, якасці ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур шляхам анкетавання, правядзення апытанняў у глабальнай камп'ютарнай сетцы інтэрнэт і іншых мерапрыемстваў з выкарыстаннем інфармацыйных і тэлекамунікацыйных тэхналогій.*

*Да 1 студзеня 2019 г. партал функцыянуе ў тэставым рэжыме.*

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/06-12-2018-3806*